Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

15 мая 2017 года, № 8 (2176)

УРАЧЫСТАСЦІ

Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Свята Перамогі.

Наша задача толькі помніць...

Штогод іх збіраецца ўсё менш – старэнькіх, нямоглых. І гавораць яны ўсё менш і цішэй. Дый што казаць, калі галоўнае даўно й шматкроць сказана, гісторыі занатаваны і апублікаваны і ў перыёдыках, і ў прыкметных святочных выданнях. Жывыя сведкі таго, што нам так лёгка забыць сярод мурашыных клопатаў падзёншчыны, звыклага камфорту і раскошы – былыя супрацоўнікі і студэнты БДУ, якія прайшлі вайну, збіраюцца, каб мы прабівалі сваю корку абыякавасці і... помнілі.

5 мая ва ўнутраным дворыку БДУ нарэшце зялёна. Маладзёны зачакаліся цяпла – рапранутыя не па надвор'і. Стаяць купкамі, абмяркоўваюць будучыя вандроўкі, каэсэры. «Вы не супраць, калі я пад шумок збягу?». Выкладчыкі перагаворваюцца: «Сваіх прывёў, ды колькі – ці іх 15, ці 12, не разбярэш». – «А мае ж дзе? Ну, вунь стаяць, з гваздзікамі». Грымнуў аркестр, вайскоўцы пайшлі маршыраваць па алеях – дружна, ладна, як належыць. Курсанты ваеннага факультэта – хлопцы як на падбор. Кітайцы глядзяць захоплена, свае ледзь кідаюць вокам: вядома, прывыклі. Пляцоўка перад рэктаратам аформлена ў стылі «пераможных» саракавых гадоў: маскіровачная сетка, брызентавы намёт, палявая кухня. Троху асобна трымаюцца ўдзельнікі Міжнароднага студэнцкага форуму «Святло Вялікай Перамогі»: урачыстыя пінжакі-гальштукі, бэйжды, адчуваецца нейкая падцягнутая бадзёрасць – напярэдадні ў іх яшчэ тры дні інтэнсіву ў «Брыганціне»: ваеннае кіно, трэнінгі, дыскусіі, вечарыны ля вогнішча, ваенна-патрыятычныя гульні, таварыскія спартыўныя матчы, сустрэча з рэктарам БДУ – усё для развіцця ў студэнцтва грамадзянска-патрыятычных якасцяў і каштоўнасцяў. У форуме сёлета бяруць удзел каля 150 юнакоў і дзяўчат з Азербайджана, Латвіі, Літвы, Украіны, Расіі, а таксама навучэнцы беларускіх ВНУ. І хаця ўсіх паўтары сотні, відавочна, няма, вока радуюць свежыя нетутэйшыя твары.

(Заканчэнне на с. 2)

УРАЧЫСТАСЦІ

Свята Перамогі.
Наша задача толькі помніць...

(Заканчэнне. Пачатак на с. 1)

Студэнт Бакінскага дзяржаўнага ўніверсітэта **Эміль Абіеў** вітае ветэранаў і ўсіх прысутных на свяце ад імя Азербайджанскай рэспублікі, дзячыць адміністрацыі абодвух БДУ за шчыльную супрацу ў навуковай і грамадскай дзейнасці: *«У гады Вялікай Айчыннай больш за 600 тыс. азербайджанцаў змагаліся на ўсіх франтах за Радзіму – Савецкі Саюз, з іх больш за палову загінула. Азербайджан быў галоўным пастаўшчыком нафты на фронт. Дзякуючы перадавым распрацоўкам нашых геолагаў-нафтавікоў войскі былі заўсёды забяспечаны нафтапрадуктамі. Яшчэ ў нас распрацоўвалася і выраблялася каля 130 відаў узбраення. Для нас беларусы, якія прынялі на сябе першы ўдар агрэсара, з'яўляюцца ўзорам трываласці і самаахвярнасці, адзінства перад тварам агульнага ворага. Такая велізарная колькасць значных змаганняў і бітваў адбылася на тэрыторыі Беларусі... Мы падзяляем з вамі радасць перамогі і горыч страт. Для нашай дэлегацыі сёння вялікі гонар знаходзіцца тут, разам з удзельнікамі тых лёсавызначальных падзей, і мы кажам «дзякуй» усім прысутным ветэранам за іх подзвіг для наступных пакаленняў».*

Кранальная пастаноўка студэнтаў БДУ аднавіла трагічныя сцэны ад пачатку вайны – страх і разгубленасць юнакоў і дзяўчат, заспетых нечаканай бядой, боль расставання, першыя лісты, галашэнне маці па загінулых чатырох сынах-дубочках... Не толькі ветэраны і дзеці вайны, але і айпэд-маладзёны не стрымлівалі слёз.

Студэнт гістфака, сакратар БРСМ **Канстанцін Андрусевіч:** *«Хочацца ад імя студэнцкай моладзі выказаць словы падзякі ўсім тым, хто ваяваў і набліжаў Перамогу, спрыяў ёй сваёй самаахвярнай працай у БДУ, і пажадаць увагі і любові ад блізкіх, упэўненасці ў заўтрашнім дні – і вам, дарагія ветэраны, і ўсёй нашай краіне».*

Па традыцыі ўдзельнікі свята ўсклалі кветкі да помніка студэнтам і выкладчыкам БДУ, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Гледзячы на дзетак з партрэтамі загінулых герояў, міжволі думаеш – а ці будзем мы збірацца святкаваць Перамогу праз дзесяць, дваццаць гадоў, калі нікога са сведкаў тых падзей ужо не будзе з намі? Ці здолеем вытрымаць належны тон, ці перайначым усё пад свае разбэшчаныя густы? Будзем спадзявацца, што і сустрэчы гэтыя працягнуцца, і стэндапіць салёныя жарцікі на святых костках ніхто не наважыцца. Бо такія святы, як сённяшняе, выхоўваюць густ і павагу, пашану і высакароднасць. Прыслухаемся ж яшчэ раз, як да камертона, да словаў, абпаленых вайной...

Ветэран **Ларыса Аляксандраўна Шымко:** *«Калі мы ў Брэсце сышлі з платформы, дык цалавалі зямлю, бо вярнуліся на Радзіму. Маму ў нас забралі, нас было пяцёра дзяцей, аднаго немцы замучылі. Давалі яму звечара нейкія лекі, а зраніцы бралі кроў – то бок, выпрабоўвалі на ім лекі для нямецкіх салдат».*

Ветэран **Фёдар Сяргеевіч Фешчанка** пра вайну гаворыць сціпла: стралковы батальён у Пермскай вобласці, артылерыйскі полк Беларускага фронту, аперацыя «Багратыён»... Вайна загартавала, шмат чаму навучыла, і гэты баявы дух Фёдар Сяргеевіч захоўваў і ў мірны час. Захапляўся штангай, і калі быў перапынак 10 хвілін – выходзіў і трэніраваўся. Са студэнта вырас у выкладчыка, стаў прафесарам кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін і – легендай. Пасля 45 гадоў ва ўніверсітэце прафесар Фешчанка і сёння тут чаканы госць.

Падзякаваўшы ветэранам і пажадаўшы ім добрага здароўя, рэктар **Сяргей Абламейка** выказаў спадзяванне, *«каб яшчэ не адзін год, не адно дзесяцігоддзе з намі былі разам тыя, хто вынес на сваіх плячах перамогу ў той цяжкай вайне, каб мы выхоўвалі разам моладзь, паказвалі, як трэба любіць і абараняць сваю Радзіму».* А яшчэ паабяцаў зрабіць усё магчымае, *«каб у наш няпросты час Беларусь квітнела».*

Аркестр граў урачыста-журботную «Радзіма мая дарагая», гэтак мілую патрыятычна настроенаму вуху. Няпростая работа сёння толькі помніць... Ад пераніцоўкі гісторыі пад бягучыя высакародныя мэты лепш за ўсё ратуюць факты – скрупулёзна сабраныя гісторыкамі БДУ, яны леглі ў аснову ***Мемарыяла «Памяць у імя жывых»*** супрацоўнікам і студэнтам БДУ, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мяркуецца, што такіх звыш трохсот чалавек. Сёння вядома пра 67 герояў, чые імёны занесены ў мемарыяльную электронную базу. Вядзецца вялікая даследчая праца па пошуку інфармацыі пра сотні загінулых супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ. Электронны рэсурс, што размешчаны на сайце *www.time.bsu.by*, дазволіць уносіць новыя імёны па меры з'яўлення звестак. Адкрыццё мемарыяла «Памяць у імя жывых» завяршала ўрачыстую частку свята. Салдацкая каша з армейскага катла нагадала прысутным пра суровы вайсковы побыт – але без прысмаку пораху, крыві й поту падалася дужа смачнай. Пакуль кітайцы (па-ранейшаму захоплена) распытвалі, што за каша такая – пярлоўка, а «свае», аплятаючы пачастунак, згадвалі нутром тое простае і сапраўднае, што нельга забыць, героі свята, ветэраны выправіліся на святочны банкет...

Сцяпан Рыгоравіч Драбязка ўжо стаміўся – 95 гадоў не жарт. Чакае машыну, якая павязе яго дадому, і распавядае, як штогод на свята Перамогі па яго прыязджаюць з універсітэта: *«Бяруць мяне аднаго. Жонка на 6 гадоў маладзейшая, але хворая, напаўсляпая. Жывем з сынам у адной кватэры, другі сын загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Ёсць і ўнукі – цэлая арганізацыя ўнукаў пад маім кіраўніцтвам, 7 чалавек! Такое шчасце! Расказваю ўнукам пра вайну... Скончыў у Мінску сярэднюю школу і быў прызваны ў войска яшчэ да вайны. Пры пачатку вайны трапіў у пяхоту. Праз некалькі месяцаў быў залічаны ў школу авіяцыйных механікаў, з ёй і не расставаўся, стаў прафесарам. Кафедра была баявая... У Германіі чытаў лекцыі – навучаў немцаў дэмакратыі, а то яны разбасячыліся... Здароўе, канечне, не радуе. Дактары лічаць, што мне можна ўжо не лячыцца – усё адно выніку няма, хопіць. Патрэбен нямецкі прэпарат, а карыстаюся ўкраінскім, прывозяць з Масквы – назва ў іх амаль аднолькавая, а вось вынік зусім розны. Але іншага выхаду няма. Ёсць найвышэйшы закон, аб'ектыўны, боскі – чаму чалавек жыве, а потым сыходзіць. Застаецца толькі забыцца на хваробы... Дзякуй, што не забываецеся. Студэнты прыязджаюць, віншуюць з народзінамі, са святам 23 лютага і, канечне, на свята Перамогі».*

Прапускаць праз сябе чужы боль, прыгадваць сваіх сваякоў, дзядоў і прадзедаў, загінулых у час вайны – усё гэта праца душы, да якой мы сёння нязвыклыя, якой пазбягаем ці то з ляноты, ці з абыякавасці, не жадаем пакідаць сваёй зоны камфорту... Але толькі праз такую працу, праз гэты боль мы можам адчуць, як востра дарагое нам жыццё і якое яно прыўкраснае – і зразумець: за ўсё, што мы маем, за гэта свята жыцця мы абавязаны тым, хто ваяваў і гінуў. Выжываў у тых умовах, калі здавалася, што выжыць ужо немагчыма. Іх жыццё павінна было быць напоўнена бестурботнай весялосцю, такой самай, якую мы назіраем сёння. А на іх дзіцячыя і юнацкія плечы лёг цяжар ваенных турбот і бедаў. Хай сёння палямі змаганняў будуць навука і культура, творчасць і мастацтва, і хай нашы дзеткі ніколі не зведаюць жахаў вайны.

Падрыхтавала
Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

Даведка

Да вайны ў БДУ налічвалася 6 факультэтаў і 33 кафедры. Тады тут вучылася 1400 студэнтаў, працаваў 151 навуковы працаўнік, адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу налічвалася 210 чалавек, а навучальна-дапаможнага – 90. Такім чынам, агульная колькасць чалавек склала 1851. Толькі ў першыя дні вайны 450 студэнтаў і выкладчыкаў добраахвотнікамі сышлі на фронт. Эвакуявацца паспелі толькі 620 чалавек, з тых, хто застаўся ў горадзе, большасць стала актыўнымі ўдзельнікамі падпольнага і партызанскага руху.

12 супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ ўдастоены звання Героя Савецкага

НАША СПАДЧЫНА

Інтэлектуальная эліта Беларусі: гісторыя ўзнікнення

Хто стаяў ля вытокаў беларускай навукі і адукацыі? На гэтае пытанне адказваюць гісторыкі Белдзяржуніверсітэта ў кнізе «Інтэлектуальная эліта Беларусі. Заснавальнікі беларускай навукі і вышэйшай адукацыі (1919–1941)». Гэта першае выданне з серыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт: 100 гадоў на карысць Айчыны», якая рыхтуецца да стагоддзя ўніверсітэта. 17 красавіка на гістарычным факультэце адбылася прэзентацыя кнігі.

На ёй выступілі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, прарэктар па вучэбнай рабоце Сяргей Ходзін, дэкан гістарычнага факультэта Аляксандр Каханоўскі і прафесар Алег Яноўскі.

Рэктар пачаў з таго, што ўзгадаў пра Дэкрэт аб заснаванні БДУ, які быў прыняты ў 1919 годзе. І дадаў, што звычайна ўніверсітэты лічаць дату свайго нараджэння ад моманту прыняцця Дэкрэта. Дарэчы, ідэя стварэння дадзенай кнігі (як і цэлай серыі) таксама належыць Сяргею Уладзіміравічу.

«Тое, што ў гэты час стала развівацца навука – гэта факт. Мы вырашылі паказаць яе развіццё на базе БДУ, паказаць, як нараджалася адукацыя на Беларусі, і тых людзей, якія стваралі ўніверсітэт», – патлумачыў рэктар.

Фота Васіля КУЗЬМЕНКІНА

У сваю чаргу Сяргей Ходзін заўважыў: «Гісторыкам трэба падкрэсліваць тое важнае, што было зроблена нашымі папярэднікамі. Мы разумеем, што няма патрэбы даказваць вялікую ролю БДУ ў інтэлектуальным развіцці нашай краіны, але важна напісаць пра гэта».

Мэта праекта – прадставіць слупы грамадства, якія рухалі навуку і адукацыю на працягу стагоддзя. Праз жыццёвыя і творчыя біяграфіі выбітных навукоўцаў БДУ паказаць значэнне навукі і вышэйшай адукацыі ў фарміраванні нацыянальнай беларускай дзяржавы. У першым выданні прадстаўлены біяграфіі 27 беларускіх інтэлектуалаў, якіх справядліва лічаць не толькі стваральнікамі найважнейшых напрамкаў фундаментальных і прыкладных даследаванняў у галіне гуманітарных і прыродазнаўчых ведаў у Беларусі, але і творцамі новай універсітэцкай сферы.

«Вельмі важна, калі да гісторыі нашага ўніверсітэта будуць прыцягвацца шырокія пласты навуковай гістарычнай супольнасці і тых, каго цікавіць гісторыя, з іншых факультэтаў», – адзначыў прарэктар.

На працягу года над выданнем працавала 15 аўтараў, навуковым рэдактарам кнігі выступіў прафесар Алег Яноўскі:

– Гэта навуковае выданне, але там вы не знойдзеце ніводнай зноскі, ніводнай спасылкі. За кожным фактам стаіць дакумент, вельмі дакладныя звесткі, якія ўзяты з розных крыніц. Праца знайшла водгук у тых, хто хаця б дакрануўся да таго тэксту, які мы сёння прадстаўляем. Гэтыя прыклады памножацца, калі кніга стане больш даступная для шырокага чытача, калі звернуцца не толькі асабіста зацікаўленыя, але і тыя, хто цікавіцца гісторыяй навукі і вышэйшай адукацыі. Я часта думаю: як можна рэалізаваць сябе толькі, здаецца, у адной такой справе – гісторыі альма-матар. Часу не хапае. Тых кірункаў, якія хацелася ахапіць і пазначыць, узнавіць і рэанімаваць з той гістарычна недалёкай даўніны – гэта не пад сілу аднаму чалавеку, нават дваім. Па сутнасці, адзін-два чалавекі сёння стала займаюцца гісторыяй нашай установы. Гісторыкі ўзяліся за справу, якая была ініцыявана рэктарам, і такімі калектыўнымі намаганнямі мы нарэшце можам зрабіць тое, што дазваляюць нам рабіць крыніцы, якія ёсць і якія яшчэ трэба здабыць. На некаторыя рэчы, што здаюцца звыклымі з таго часу, можна паглядзець інакш. Інтэлектуальнае асяроддзе, якое стваралася і будзе стварацца – гэта прадмет нашай навуковай зацікаўленасці.

Наталля КУДРАШОВА

АСОБЫ

Легенда з БДУ

100 гадоў таму – 14 мая 1917 г. – у Мінску нарадзіўся адзін з выбітных канструктараў XX стагоддзя, распрацоўшчык ядзернай зброі **Аркадзь БРЫШ.**

А. А. Брыш – наш зямляк, выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, партызан Вялікай Айчыннай вайны, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Расійскай Федэрацыі, доктар тэхнічных навук. Прафесар Аркадзь Адамавіч Брыш – адзін са стваральнікаў ядзернай зброі ў СССР.

На пасадзе галоўнага канструктара ядзерных боепрыпасаў СССР А. А. Брыш працаваў з 1964 да 1993 гг., затым 12 гадоў – на пасадзе галоўнага канструктара ядзерных боепрыпасаў Расіі. З 1996 года і да канца жыцця ён з'яўляўся ганаровым кіраўніком Расійскага федэральнага навукова-даследчага інстытута авіяцыйнай аўтаматыкі. Апошнія гады жыцця ён вёў навуковую працу па бяспечным захоўванні і мірным выкарыстанні назапашаных раней ядзерных зарадаў, працаваў па ўпарадкаванні навуковай спадчыны і захаванні айчыннага прыярытэту ў гэтай, раней такой сакрэтнай, галіне навукі. Выдавецкую дзейнасць Аркадзя Адамавіча красамоўна ілюструюць унікальныя кнігі «Ваенная моц Савецкага Саюза: ад Сталіна да Гарбачова», «Чалавек стагоддзя Юлій Барысавіч Харытон», у якіх яму належаць не толькі вялікія артыкулы, але і навуковае рэдагаванне і арганізацыйная праца як члена рэдкалегіі.

Аркадзь Адамавіч Брыш нарадзіўся 14 мая 1917 года ў Мінску ў сям'і настаўніка фізікі. Пасля сямі класаў сярэдняй школы Аркадзь Брыш паступіў у фабрычна-завадское вучылішча. Працоўную дзейнасць пачаў у 14 гадоў вучнем электраманцёра Беларускай канторы Усесаюзнага электратэхнічнага аб'яднання. У 1932–1935 гады, працуючы электраманцёрам, вучыўся ў вячэрняй школе Заходняй чыгункі. Пасля сярэдняй школы ў 1935 годзе паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1940 годзе дыпламаваны фізік А. А. Брыш пачаў працу ў Інстытуце хіміі АН БССР з заданнем: рэнтгенаграфічнымі метадамі даследаваць структуру і фазавы склад розных рэчываў.

Аднак пачалася вайна, і прыйшлося адмовіцца ад сваіх планаў. Адразу ж пасля прыходу нямецка-фашысцкіх захопнікаў Аркадзь Брыш уключыўся ў працу падпольнай групы, якую ўзначальвала Анастасія Фамінічна Верамейчык, а затым перайшоў у разведгрупу штаба брыгады імя К. Варашылава, якая дзейнічала ва Уздзенскім раёне.

За ўдзел у баявых аперацыях у тыле ворага А. А. Брыш узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. У 1944 годзе рашэннем штаба партызанскага руху Беларусі А. А. Брыш быў адкамандзіраваны для працягу навуковай працы ў Інстытут машыназнаўства АН СССР у Маскву.

У ліпені 1947 года, пасля нядоўгай працы ў Інстытуце машыназнаўства АН СССР, Аркадзь Адамавіч Брыш накіраваны ў КБ-11 (адкрытая назва «Навукова-эксперыментальная лабараторыя Прыволжскай канторы Галоўгарбуда СССР») – цяпер Усерасійскі навукова-даследчы інстытут эксперыментальнай фізікі, дзе займаліся распрацоўкай ядзернай зброі.

А. А. Брыш спачатку займаўся ўдасканаленнем методыкі фотахранаметрычнай рэгістрацыі, але ўжо ў кастрычніку 1947 года пачаліся яго самастойныя эксперыменты па распрацоўцы метаду вымярэння ціску ў дэтанацыйнай хвалі. Неўзабаве Аркадзем Адамавічам і яго групай быў выяўлены новы фізічны эфект – з'яўленне высокай электрычнай праводнасці прадуктаў выбуху пад дзеяннем моцных ударных хваль. У паспяховым выпрабаванні першага атамнага зарада ў жніўні 1949 года ёсць значны асабісты ўнёсак А. А. Брыша.

У 1955 годзе А. А. Брыша пераводзяць у Маскву ў НДІ авіяцыйнай аўтаматыкі і прызначаюць намеснікам галоўнага канструктара. Перад ім была пастаўлена задача: распрацаваць сучасныя аўтаматызаваныя сістэмы для ядзернай зброі. Для рашэння пастаўленай задачы Аркадзь Адамавіч прыцягнуў дасведчаных спецыялістаў з авіяцыі, што дазволіла ў кароткія тэрміны распрацаваць аўтаматыку падрыву ядзерных боепрыпасаў. А затым знаходзіў таленавітую моладзь, вучыў іх і вучыўся з імі, ствараючы адмысловыя вырабы, бартавыя прыборы і кантрольную апаратуру для розных тыпаў боепрыпасаў. Да 1960 года вага аўтаматыкі была паменшана ў 15 разоў у параўнанні з першапачатковым, а да 1970 года – у 50 разоў. Створаныя ў інстытуце прылады вылучаліся высокімі навукова-тэхнічнымі паказчыкамі, высокай надзейнасцю, практычнай бяспекай, устойлівасцю і зручнасцю эксплуатацыі. Некаторыя з іх не маюць аналагаў у сусветнай практыцы да нашых дзён.

Аркадзь Адамавіч не парываў сувязяў з Беларуссю: горача цікавіўся справамі роднага ўніверсітэта. Прыязджаючы ў Мінск, ён заўсёды з вялікім задавальненнем сустракаўся са студэнтамі, выкладчыкамі, навукоўцамі БДУ і НАН Беларусі. З радасцю Аркадзь Адамавіч сустракаў гасцей з Мінска ў сваёй маскоўскай кватэры. Беларусь не толькі месца, дзе прайшлі 27 гадоў яго жыцця, месца, дзе нарадзіўся, рос, вучыўся, ваяваў Аркадзь Адамавіч. Сюды ён прыязджаў сустракацца з аднапалчанамі. Тут у яго былі знаёмыя лясы, дамы і вуліцы, сябры юнацкасці і новыя знаёмыя. Тут быў бацькоўскі дом. У кожны свой прыезд Аркадзь Адамавіч імкнуўся наведаць магілы бацькі і маці. Неяк пасля сумеснай паездкі на могілкі Аркадзь Адамавіч прызнаўся аўтару гэтай нататкі: «Пабыў на магілах і як бы пагаварыў. Час ад часу я фізічна адчуваю неабходнасць прыязджаць сюды. Пабываю на магілах, становіцца лёгка. Пройдзе нейкі час, адчуваю: трэба зноў ехаць». Апошні раз Аркадзь Адамавіч прыязджаў у Мінск у 2014 годзе, за два гады да свайго скону.

Выпускнік фізіка-матэматычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Аркадзь Адамавіч Брыш быў адным з тых, хто зрабіў значны ўнёсак у стварэнне ў нашай агульнай краіне СССР магутнага фактару стрымлівання, які змог ацверазіць змагароў кіраваць іншымі народамі і распараджацца іх лёсам. Таму мы ганарымся нашым земляком, шануем яго імя як працаўнікоў-герояў, якія стварылі прыладу, што дазволіла засцерагчы свет ад вялікай вайны на працягу дзесяцігоддзяў.

Эдуард ШПІЛЕЎСКІ,
вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі Інстытута цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава

Заснавальнік школы біяфізікі і клетачнай інжынерыі

Акадэміку НАН Беларусі, доктару біялагічных навук, прафесару кафедры біяфізікі фізічнага факультэта **Сяргею ЧАРАНКЕВІЧУ споўнілася 75 гадоў.**

С. М. Чаранкевіч нарадзіўся 20 красавіка 1942 г. у в. Палянічыцы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. У 1964 г. скончыў фізічны факультэт БДУ. З 1965 г. аспірант, асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры біяфізікі (з 1980 г.).

У 1969 г. С. М. Чаранкевіч абараніў дысертацыю па спецыяльнасці «Оптыка». У 1989 г. абараніў доктарскую дысертацыю па спецыяльнасці «Біяфізіка». У 1990 г. прысвоена навуковае званне прафесара. У 2000 г. ён стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі за цыкл прац «Біяфізічныя механізмы функцыянальнага водгуку клетак». У 2009 г. абраны акадэмікам НАН Беларусі.

С. М. Чаранкевіч – вядомы навуковец у галіне біяфізікі, клетачнай інжынерыі, клетачнай інфарматыкі, нейраінфарматыкі, медыцынскай біяфізікі. С. М. Чаранкевіч сумесна з прафесарам Г. Г. Марціновічам прапанаваў і даказаў новую навуковую канцэпцыю пра ўдзел унутрыклетачных рэдокс-фактараў у падтрыманні гамеастазу клеткі.

У апошнія гады С. М. Чаранкевіч паспяхова развівае новыя навуковыя кірункі, у тым ліку распрацоўвае прынцыпы стварэння новых вылічальных прылад тыпу нейрачыпаў і нейрапрацэсараў на аснове спалучэння жывых нейронаў і паўправадніковых электронных прылад, а таксама вывучае законы навучання і механізмы фарміравання памяці ў нейронавых сетках мозгу. Ён распрацаваў шэраг арыгінальных біямедыцынскіх тэхналогій, заснаваных на вывучэнні працэсаў, звязаных з генерацыяй, рэгуляцыяй і ўтылізацыяй актыўных формаў кіслароду і азоту клеткамі для дыягностыкі і тэрапіі захворванняў, звязаных з парушэннямі імунітэту.

С. М. Чаранкевіч стварыў у БДУ навуковую школу ў галіне клетачнай і медыцынскай біяфізікі і клетачных тэхналогій. Падрыхтаваў 29 кандыдатаў і 3 дактароў навук. Ён з'яўляецца аўтарам больш як 700 публікацый, у тым ліку 440 асноўных навуковых прац, 48 аўтарскіх сведчанняў і патэнтаў, 5 манаграфій і 5 навучальных дапаможнікаў (у суаўтарстве).

Сяргей Мікалаевіч у наш час чытае лекцыйныя курсы «Фізіка біясістэм», «Фізіка мембранных сістэм», «Біяфізіка клеткі», «Фізічныя асновы структурнай і сістэмнай біялогіі», «Сучасныя праблемы біяфізікі» на фізічным факультэце. Кіруе навуковай працай студэнтаў і аспірантаў.

С. М. Чаранкевіч узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (1999), медалём «За працоўныя заслугі» (2011), Ганаровай граматай Савета Міністраў Беларусі (2016 г.). Заслужаны работнік БДУ.

Калектыў кафедры біяфізікі сардэчна віншуе Сяргея Мікалаевіча з юбілеем, жадае яму дужага здароўя і новых творчых поспехаў.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

01 мая Клебановіч Мікалай Васільевіч, дэкан геаграфічнага факультэта
02 мая Кавалёў Міхаіл Міхайлавіч, дэкан эканамічнага факультэта
08 мая Лушчынская Вольга Уладзіміраўна, загадчык кафедры англійскай мовы і маўленчай камунікацыі
01 мая Гоман Дзмітрый Мікалаевіч, дацэнт кафедры класічнай філалогіі
21 мая Даракупец-Навіцкая Аксана Міхайлаўна, старшы выкладчык кафедры прыкладной лінгвістыкі
18 мая Саўко Іна Эдуардаўна, дацэнт кафедры рыторыкі і выкладання мовы і літаратуры
29 мая Машчэнская Людміла Рыгораўна, прафесар кафедры рускай мовы
03 мая Мельнікава Людміла Іванаўна, дацэнт кафедры тэлебачання і радыёвяшчання
22 мая Цімошчанка Андрэй Ігаравіч, загадчык кафедры ядзернай фізікі
31 мая Багамазаў Аляксей Пятровіч, начальнік УВРМ

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ міжнароднага турызму;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднага менеджменту, міжнароднага турызму, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, тэхналогій камунікацыі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай, мовазнаўства і краіназнаўства Усходу, псіхалогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, дызайну.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БДУ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ біялогіі чалавека і экалогіі; радыяцыйнай гігіены і эпідэміялогіі; загадчыкаў кафедраў фізічнага выхавання; філасофіі, сацыялогіі і эканомікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ экалагічнага маніторынгу і менеджменту; біяхіміі і біяфізікі; радыяцыйнай гігіены і эпідэміялогіі;

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры замежных моў;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ замежных моў; біяхіміі і біяфізікі; біялогіі чалавека і экалогіі; імуналогіі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: г. Мінск, вул. Даўгабродская 23/1, каб. 202, тэл. 398-88-25.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Пра святкаванне Дня Перамогі ў БДУ – БелТА, sb.by (03.05), Мінск-ТБ, АНТ, БТ-1, minsknews.by, 21.by, wuz.by, 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, радыё «Сталіца», zviazda.by (05.05).

Інтэрв'ю рэктара Сяргея Абламейкі парталу Саюзнай дзяржавы – Soyuz.by (26.04).

Пра фітнэс-праект БДУ «Гарачыя гульні» – БТ-1, БТ-5 (01.04).

Візіт пасла Туркменістана Назаргулы Шагулыева ў БДУ – АНТ, БТ-1, СТВ (04.04).

Пра «Бібліяноч» у Фундаментальнай бібліятэцы БДУ – БелТА, zviazda.by, tut.by (17.04), АНТ, БТ-1, «Мінскі кур'ер» (21.04).

Прыёмная кампанія стартавала ў Ліцэі БДУ – БелТА, sputnik.by, wuz.by, newsbel.by (10.04), zviazda.by (19.04).

Пра запуск беларускага ўніверсітэцкага нанаспадарожніка – belarus.kz (07.04), БелТА, АНТ, embassybel.ru, radiominsk.by, tvnews.by, us.bsu.by, kv.by (10.04), news.vitebsk.cc, minsknews.by (12.04), hz.by (14.04).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

РЭХА ГІСТОРЫІ

Архіў прафесара Кацэнбогена

Дакументы з асабістага архіва намесніка рэктара па акадэмічнай частцы БДУ ў 1921–1925 гадах Саламона Захаравіча Кацэнбогена перададзены Музею БДУ. Цырымонія адбылася 10 мая. У ёй прынялі ўдзел прарэктар па вучэбнай рабоце Сяргей Ходзін, дэкан гістарычнага факультэта Аляксандр Каханоўскі, унук прафесара Кацэнбогена Рыгор Вершкайн (Дзюсельдорф, Германія) і інш.

Фота Васіля КУЗЬМІНКІНА

Алег Яноўскі, Рыгор Вершкайн і Сяргей Ходзін

Калекцыя Музея БДУ папоўнілася больш чым на 20 гістарычна значных матэрыялаў, якія распавядаюць пра адміністрацыйную, навукова-адукацыйную дзейнасць С. Кацэнбогена. Прадстаўлены кнігі і працы па сацыялогіі пад аўтарствам прафесара Кацэнбогена, заліковая кніжка Кіеўскага камерцыйнага інстытута, датаваная 1910 годам, асабістыя і сямейныя фатаграфіі, грамата БДУ за 1925 год і інш.

Гэтыя дакументы перадаў вядучай ВНУ Беларусі ўнук прафесара Кацэнбогена Рыгор Вершкайн.

Кацэнбоген Саламон Захаравіч (10.05.1889–01.09.1946) скончыў Кіеўскі камерцыйны інстытут у 1914 г. У 1912 годзе апублікаваў працу «Сялянскія войны ў Германіі». У 1914–1917 гг. займаўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага псіханеўралагічнага інстытута і атрымаў другую вышэйшую адукацыю па праве. У 1917–1920 гг. працаваў у наркаматах сацыяльнага забеспячэння, спачатку Літвы, а затым СССР. Пэўны час быў намеснікам наркамасветы Беларусі, удзельнікам ЦВК (1920–1924). Вёў заняткі ў розных навучальных установах Мінска. З 1921 г. – прафесар БДУ, намеснік рэктара, дэкан факультэта грамадскіх навук і загадчык кафедры сацыялогіі і першабытнай культуры. Са студзеня 1926 г. – дэкан факультэта гаспадаркі і права ў Саратаўскім дзяржаўным універсітэце і загадчык кафедры дыялектычнага матэрыялізму, а ў красавіку 1928 года абраны на пост рэктара гэтага ўніверсітэта, які займаў да чэрвеня 1932 г. З 1932 па 1935 гады ўзначальваў Ленінградскі педагагічны ўніверсітэт імя А. І. Герцэна.

Далейшая яго дзейнасць была звязана з працай у розных ВНУ Расіі. Кацэнбоген даследаваў праблемы першабытнай культуры і марксісцкай сацыялогіі.

З імем гэтага навукоўца звязана інстытуалізацыя сацыялогіі як навукі і сацыялагічных даследаванняў у Беларусі. На пасяджэннях праўлення БДУ Кацэнбоген увесь час уздымаў пытанні, звязаныя з жыллёвымі патрэбамі супрацоўнікаў, дакладваў пра размеркаванне фінансавых сродкаў, якія паступалі на рахунак ВНУ. Інтарэсы ўніверсітэта, калегаў і студэнтаў былі для яго першачарговымі. Менавіта яму належаць першыя абагульняльныя справаздачы пра дзейнасць і развіццё ўніверсітэта, бо ён добра ведаў агульную карціну падзей. Дзякуючы гэтым справаздачам маецца каштоўная і ўсебаковая інфармацыя пра першыя гады станаўлення беларускай адукацыі і навукі. Універсітэцкая навука фарміравалася дзякуючы яго высілкам. У гісторыю БДУ ўвайшоў як адзін з першых прафесараў. Валодаў нямецкай, французскай і рускай мовамі.

Алена МАРЦУЛЕВІЧ

У ВОЛЬНЫ ЧАС

Студэнты змадэлявалі танкавыя баталіі

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук пры падтрымцы кампаніі Wargaming, Мінскага гаркама БРСМ і Прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ правёў 5 і 6 мая турнір па кіберспорце BSU WOT TOURNAMENT!

У турніры прынялі ўдзел студэнты розных ВНУ г. Мінска. Маладыя людзі прадэманстравалі спрыт, уважлівасць і ўменне стратэгічна думаць у камп'ютарнай гульні World Of Tanks, якая ўжо даўно заваявала сусветную вядомасць.

У адным са сталічных камп'ютарных клубаў адбыліся двухдзённыя баталіі, у якіх пазмагаліся 12 камандаў па 7 чалавек у кожнай. Сцэнарыі шматлікіх бітваў паўтаралі бітвы Другой сусветнай вайны, дазваляючы гульцам не толькі ўдасканальваць свае навыкі ў кіберспорце, але і лепш пазнаваць ваенную гісторыю.

Па выніках фінальнай гульні перамогу ў турніры атрымала каманда БНТУ «Элеватар». Другое месца ў літаральным сэнсе заваявала зборная БДУ і БДЭУ «Інквізіцыя», а 3 месца дасталася камандзе студэнтаў БНТУ і БДУІР «My little pony».

Удзельнікі камандаў-пераможцаў атрымалі падарункі ад арганізатараў турніру, а таксама адмысловы прыз ад кампаніі Wargaming – унутрыгульнявыя бонусы і рэдкія каштоўныя кнігі пра гісторыю канструявання і вытворчасці вядомых савецкіх танкаў часоў Другой сусветнай вайны СУ-152 і КВ-1.

Студэнты ФФСН ініцыявалі правядзенне турніру BSU WOT менавіта напярэдадні 72-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Такім чынам моладзь вырашыла прыцягнуць увагу да гісторыі і лепш ацаніць мірны час, у якім танкавыя бітвы, на шчасце, магчымыя толькі ў віртуальнай рэальнасці.

Рада ІВАНОВА

Фота Лізаветы САЎЛУКОВАЙ

МІЖНАРОДНАЯ ПОВЯЗЬ

Свой погляд на тэму вайны

Міжнародны форум «Святло Вялікай Перамогі» прайшоў 5–7 мая на базе САК «Брыганціна». Ён сабраў каля 150 удзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Азербайджана, Літвы і Латвіі.

Фота Аляксандра СНАПКА

Перад стартам форуму замежныя госці наведалі музей Вялікай Айчыннай вайны, паглядзелі факультэты БДУ і Мінск.

5 мая праграма СВП пачалася ва ўнутраным дворыку БДУ са святочнага канцэрта і адкрыцця мемарыяла «Памяць у імя жывых», а ў якасці абеду ўдзельнікі атрымалі сапраўдную салдацкую кашу, якая дадала сілаў на працяг дня ў «Брыганціне».

Сфарміраваліся сем камандаў, куратарамі якіх з'яўляліся актывісты студэнцкага саюза, савета старастаў і БРСМ. Кожная сваім вонкавым выглядам і творчым нумарам раскрывала абраную тэму. Тут былі і ваенкары, і персідскія вязні, і маракі.

Па прыездзе ўдзельнікі патрапілі на закрыты паказ стужкі «Сабака Руды», на якім прысутнічаў прадзюсар фільма Сяргей Ждановіч. Фільм глыбока крануў усіх і выклікаў абмеркаванне, дзе ўздымаліся тэмы акцёрскага складу, прафесіяналізму працоўнай групы і глыбіні раскрыцця характараў.

Пасля ўдзельнікі маглі выбіраць: вечар памяці ля вогнішча ці дэбаты на тэму «Увядзенне курса гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў школах».

На дэбаты прыйшло няшмат людзей, але было відаць, што яны сапраўды зацікаўленыя тэмай.

А на вечары памяці ўдзельнікі і арганізатары ля вогнішча спявалі ваенныя песні і чыталі вершы.

У другі дзень праходзілі секцыі, канферэнцыя Студэнцкай асамблеі і творчы вечар.

На сямі секцыях распавядалася пра жанчын падчас вайны, пра ваенную фатаграфію, пра псіхалогію салдатаў, пра форму і рыштунак, а таксама пра патрыятычнае выхаванне з дапамогай сучасных тэхналогій.

Канферэнцыя прайшла незвычайна: з-за вялікай колькасці замежнікаў і жадання ўдзельнікаў паслухаць пра тое, як жывуць актывісты ў іншых краінах, пытанняў да нашых старшыняў студэнцкіх арганізацый практычна не было, і амаль увесь час сышоў на размовы з гасцямі.

На творчым вечары кожная каманда ставіла нумар, які адлюстроўваў іх погляд на тэму вайны. Некалькі нумароў былі на аснове сапраўдных гісторый вязняў канцлагераў, былі ваенныя вершы, вальсы і песні.

Трэці дзень пачаўся з «Зарніцы», дзе кожны мог пакідаць сякеры, пабегаць праз пяскі і пераадолець розныя перашкоды – адным словам, прайсці мірную вайсковую падрыхтоўку.

На гэтым форум завяршыўся, пакінуўшы для кожнага з удзельнікаў і арганізатараў шмат тэм і пытанняў для разважання. Але самае галоўнае – пакінуўшы велізарнае сяброўства, якое з'яўляецца наймацнейшай абаронай свету.

Яўгенія КРЫЖАНОЎСКАЯ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

15 мая 2017 года
Падпісана да друку 12.05.2017 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by